177

# ТРЫ ГАДЫ ЖУДАСНАЙ ГІТЛЕРАЎСКАЙ НЯВОЛІ.

22-га чэрвеня 1941 г. бандыцкая армія Гітлера разам з румынскімі, фінляндскімі і інш. фашыстамі вераломна ўварвалася на тэрыторыю СССР. Вораг нарушыў мірнае жыццё совецкага народа.

На квітнеючыя землі нашай Радзімы варожыя войскі прынеслі смерць і знішчэнне, руіны і папялішчы, цярпенні і горэ.



На акупаванай тэрыторыі нямецкія нягоднікі ўстанавілі самую чорную і жудасную няволю. З першых дзён перад совецкімі грамадзянамі адкрылася заслона раздзіраючай сэрца сапраўднасці гітлераўскага панавання.

Прайдзіся па Беларусі і ты ўбачыш зруйнаваныя гарады, на месцы вёсак і хутароў свежыя і заросшыя былінов пажарышчы. Нямецкія акупанты толькі ў 40 раёнах, якія цяпер вызвалены, спалілі больш 100.000 дамоў і іншых пабудоў.



Вось груды цэглаў і асмалкі на месцы хутара. Ту пацяшаліся пажарам азвярэлыя фашысты.

Ці палічыш, колькі немцы спалілі вёсак і хутароў ў часе ваенных дзеянняў? Да чаго падобны стаў Слонім Немцы ставілі тады нашых мірных жыхароў у рад, адлічвал па пяць і пятага растрэльвалі, адлічвалі па чатыры і кож нага чацвёртага стралялі і т. д.

Калі змоўклі гарматы, а лінія фронта была далёка а нас, гітлераўцы прадаўжалі знішчальны шал. Нямецкія ценрашалы выпальвалі цэлыя вёскі, выбівалі ў іх усё насельніцтва. (Гарэжкі, Ніз, Паўлавічы, Васілевічы, Маскалі, Острава, Вялікая Воля, Малая Воля, Яварская Руда, Акунінава, Баравікі, Трыбушкі, Воўчыя Норы, Чыжыкі, Забулле, Вяценеўка...) Гарэлі кварталы Слоніма... Што ўцалела— вывозілася і цяпер вывозіцца ў праклятую Нямеччыну. Рука гітлераўскага душагуба не затрымлівалася над сівым старыком і грудным дзецем. Толькі ў вёсцы Акунінава выбіта 299 мірных жыхароў. У вёсцы Воўчыя Норы нямецкія каты жыўём спалілі 39 мірных сялян, у адным-жа гумне Андрэева спалілі жыўём 63 чалавекі...

178



Вось немец забіў дзіця, забіў бацька, падпальвае хату і рыхтуецца застрэліць матку. Такіх карцін на Беларусі тысячы.

На другі дзень пасля таго, як было выбіта ўсе насельніцтва вёскі Паўлавічы, фашысцкія зладзеі выгналі людзей з суседніх вёсак забіраць уцалеўшае дабро. Прыехаўшым сялянам прадставіўся патрасаючы вобраз. На вуліцы і на полі ляжалі ў лужах крыві маршчыністыя старыкі, людзі сярэдніх гадоў, хлопчыкі і дзяўчынкі. Цудам уцалеўшае дзіця плакала і поўзала па мёртвых і акрываўленых грудзях маці, шукаючы пажывы.

Народ ніколі не забудзе тых братніх і самотных магіл, у якіх ляжаць сотні тысяч сыноў беларускай зямлі, што палі ад рук нямецкіх душагубаў.



Магілаў многа на палёх,
На ўсіх узгорках і лагчынах.
Там брат ці бацька твой палёг,
За іх адпомсціць трэба сынам.

На пачатку вайны немцы верылі, што ім лёгка ўдасца нечаканым ударам сакрушыць сілы Саветаў. Веру гэтую выбіла з тупых галоў фрыцаў герайчная Чырвоная Армія пад Масквой, Сталінградам і на Каўказе. „Вышэйшая нямецкая раса“ яшчэ больш старанна пачала шукаць саюзнікаў сярод „ніжэйшых нацыяў“, а таксама ўзмоцніла нацкоўванне адной нацыянальнасці супроць другое. Сталі тварыцца літоўскія, латышскія, украінскія і РОА банды.

У нас на Беларусі па ўказанню обер-ката Кубэ робіцца спроба стварыць „самаахову“, якая правальваецца разам з ініцыятарам. Заступіўшы яго Готтберг творыць БЦР на чале з Астроўскім — здраднікам вялікага стажу. Пры дапамозе „рады“ немцы аб'яўляюць мабілізацыю і набор у так званую „беларускую краёвую абарону“. Але палажэнне іх астаецца ўсцяж бязрадным. Нашы людзі раскусілі, што рука Гітлера пхае іх на братабойчую разню, знішчаць самых себе.

179



Ворагу можа служыць толькі апошні вырадак народа подлы здраднік.

Немцы стараюцца цяпер праводзіць знішчэнне арода больш скрытымі способамі. Пад відам абілізацыі, ці набора на працу, пад відам нібыта сувязі партызанамі, ці эвакуацыі забіраюць людзей у турмы канцлагеры, дзе пасля доўгіх мук і катаванняў, у голадзе, атаржнай працы знішчаюць.



Вязень у страшэнных муках чакае смерці. Хто пападае гітлераўскія лапы, той не варочаецца назад.



Гоняць нашых людзей у турмы, канцлагеры і катаргу ў Нямеччыну.

Слонімская турма з'яўляецца домам мукаў і разсыльным пунктам. Перад тым, як адасланы ўвямы петралевіц гораў і чапалеўскіх палёў, у лагер смерці або на катаржныя работы ў Нямеччыну, вязняў збіваюць гумамі і цкуюць сабакамі. Шмат жыхароў Слонімшчыны саслана і ссылаюць у лагер смерці і мукаў Калдычэва каля Баранавіч.



У канцлагерах побач з рознымі садыстычнымі здзекамі запрагаюць людзей у плуг, як цягавую сілу.

Не лёгкае жыццё тых, што яшчэ застаюцца дома. Усе плады мазолістай працы грабяцца немцамі і іх халуямі. Астаўшыяся грамы хлеба наш селянін употай прымушан малоць саматужна ў жорнах, бо мельніцы працуюць не для селян. Такую „культуру“ завялі на Беларусі прадстаўнікі „вышэйшай расы“. Больш таго, зараз селяніну не будзе чаго малоць і ў жорнах. Сёлетнія пасевы скошваюцца, знішчаюцца на пні.



Подлыя акупанты здзекваюцца і гвалцяць нашых жанчын. (Збочнае, Мыслава, Савічы, Какошчыцы і іншыя).

У кожным загадзе, у кожным мерапрыемстве немца крыецца імкненне знішчыць наш край і народ. Наблізіліся дні аканчальнай расплаты за ўсё тое гора, што прынёс акупант сюды. Сення аб'яднаныя нацыі грамяць немцаў на ўсходзе, захадзе і поўдні. Трэба стварыць для ворага такія ўмовы, каб ён не меў нават магчымасці думаць аб знішчэнні мірнага жыхарства. Хай на кожнай дарозе, пры кожным кусце спаткае пагібель гітлераўскага людаеда.

**Пракляцце і смерць нямецкім акупантам!**

Чэрвень 1944 г.

Выданне Слонімскага Антыфашысцкага Камітэта.

180